**ДА 77-ГОДДЗЯ ВЯЛІКАЙ ПЕРАМОГІ**

**Алеся КОРСАК**

# Месцы знішчэння і пахавання цыганскага насельніцтва Беларусі ў перыяд нацысцкай акупацыі 1941-1944 гг.



**КОРСАК Алеся Іосіфаўна.**

*Загадчык кафедры гісторыі і турызму гуманітарнага факультэта Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат гістарычных навук, дацэнт. Нарадзілася ў г. п. Шаркаўшчына Віцебскай вобласці. У 2004 г. скончыла Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М.Машэрава. Займаецца даследаваннем палітыкі генацыду насельніцтва на тэрыторыі Беларусі перыяду нацысцкай акупацыі 1941-1944 гг., пытаннямі мемарыялізацыі воінскіх пахаванняў і месцаў масавага знішчэння мірнага насельніцтва і іх верыфікацыі. Аўтар-складальнік даведніка "Воинские захоронения и захоронения жертв нацизма на территории Полоцка, Новополоцка и Полоцкого района периода Великой Отечественной войны" (Наваполацк, 2020), суаўтар калектыўнай манаграфіі "Народ и власть: оккупанты, коллаборационисты и партизаны на пограничной территории Беларуси и Северо-Запада России в 1941-1944 гг." (СПб., 2022), каля 100 навуковых публікацый.*

**Нацысцкая акупацыя тэрыторыі Беларусі пакінула за сабой месцы масавага знішчэння мірнага насельніцтва і ваеннапалонных, дзе ляжаць прадстаўнікі розных нацыянальнасцяў. Адны загінулі ў ходзе баявых дзеянняў, а іншыя сталі ахвярамі па прычыне сваёй нацыянальнасці.**

**Гістарыяграфічны агляд.** Праблема вывучэння генацыду яўрэйскага насельніцтва ў гады Другой сусветнай вайны як на тэрыторыі акупаваных нацыстамі еўрапейскіх дзяржаў, так і на беларускіх землях, на наш погляд, вывучана ў дастатковай меры. У той жа час цыганскае насельніцтва, якое пражывала на тэрыторыі Беларусі ў перыяд германскай акупацыі 1941-1944 гг., не знаходзілася ў фокусе ўвагі айчынных даследчыкаў як асобная катэгорыя ахвяр расавай палітыкі нацыстаў. У савецкі перыяд дадзенай праблеме не надавалася належнай увагі па прычыне даследавання ў першую чаргу трагедыі беларускіх вёсак, у межах якой фіксавалася знішчэнне цыганскага насельніцтва.

Выданні постсавецкага перыяду канцэнтраваліся вакол вывучэння этнаграфіі цыган, амаль не закранаючы тэму іх праследу лад час Вялікай Айчыннай вайны[1]. Сітуацыя стала змяняцца ў 2000-х гг. Адным з першых у беларускай гістарыяграфіі да тэмы генацыду цыган звярнуўся Дз.Крывашэй. У працы "Судьбы народов Беларуси под оккупацией (июнь 1941 г. — июль 1944 г.)"[2] аўтарам прадстаўлена гісторыя нацыянальных супольнасцяў Беларусі ў перыяд акупацыі 1941-1944 гг. Адзін з падраздзелаў раскрывав некаторыя факты генацыду ў адносінах да цыганоў на тэрыторыі Беларусі.

Замежная гістарыяграфія прадстаўлена ў асноўным працамі расійскіх і германскіх аўтараў. Так, двухтомнае манаграфічнае даследаванне расійскага аўтара М.Бяссонава[3] раскрывае асноўныя факты трагедыі цыганскага народа ў гады Другой сусветнай вайны. Каштоўнасць выдання ў тым, што яно заснавана на дакументах замежных і расійскіх архіваў, а таксама на ўспамінах сведкаў падзей, якія адбываліся ў тым ліку і на тэрыторыі Беларусь. Аўтар агаворваецца, што вусная гісторыя прадстаўлена звесткамі толькі ад тых людзей, якія былі сведкамі падзей на Беларусь

Гісторыі беларускіх цыганаў у перыяд 1941-1944 гг. прысвечана некалькі навуковых артыкулаў нямецкага гісторыка А.Фрыдмана[4]. Яго працы заснаваныя на манаграфічных даследаваннях вядучых германскіх гісторыкаў, такіх як Х.Герлах, М.Цымерман і інш., з прыцягненнем архіўнага матэрыялу.

Нельга абысці ўвагай выданне "Загадка балтийских цыган...", у якім больш як за дваццаць старонак прысвечана цыганам Беларусь. Аўтарамі прыводзяцца шматлікія факты знішчэння нацыстамі цыганскага насельніцтва на тэрыторыі Беларусь. У той жа самы час, да прыкладу, М.Бяссонаў, з асцярогай падыходзіць да лічбаў аўтара дадзенай кнігі В.Калініна, якія прыведзены, як заўважана расійскім даследчыкам, у большасці сваёй без спасылак[5].

Аўтар артыкула не прэтэндуе на паўнату гістарыяграфічнага агляду. Яго мэта — паказаць існуючы прагал у даследаванні азначанай праблемы. Тым не менш можна канстатаваць тое, што даследаванне генацыду цыганоў на тэрыторыі Беларусі ў перыяд акупацыі як асобнай катэгорыі ахвяр нацысцкай знішчальнай палітыкі знаходзіцца ў распрацоўцы. Паўнавартаснае комплекснае даследаванне вышэйпазначанай праблемы ў айчыннай гістарыяграфіі пакуль што адсутнічае.

**Крыніцы даследавання.** Галоўная праблема, якая, на наш погляд, не дазваляе ў поўнай меры раскрыць пытанне генацыду цыганоў на тэрыторыі Беларусі, заключаецца ў абмежаванай колькасці архіўных дакументаў. Выкладзеныя ў іх факты трэба збіраць па крупінках. Зазначым, што факты знішчэння цыганоў могуць утрымлівацца і ў справаздачных дакументах германскага кіраўніцтва акупаванай імі Беларусі, і ў аператыўных зводках і актах партызанскіх фарміраванняў па фактах здзейсненых злачынстваў, і ў паказаннях сведкаў падзей, зафіксаваных у матэрыялах Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі, па ўстанаўленні і расследаванні злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў і іх саўдзельнікаў і нанесенай імі шкоды грамадзянам, калгасам, грамадскім арганізацыям, дзяржаўным прадпрыемствам і ўстановам па БССР (далей — НДК), і г.д.

Крыніцы па тэме даследавання прадстаўленыя ў асноўным дакументамі і матэрыяламі НДК. Пры іх аналізе аўтарам артыкула звярталася ўвага ў першую чаргу не на выніковыя дакументы дзейнасці раённых і гарадскіх камісій, а на "нізавы" блок матэрыялаў, якія складаюць аснову актаў. Многія факты не ўнесены ў заключныя дакументы, якія тычацца знішчэння цыганскага насельніцтва, з-за таго, што з пункта гледжання іх скпадальнікаў яны маюць малаінфарматыўны характар і нешматлікія па колькасці ахвяр у параўнанні з яўрэйскім і беларускім насельніцтвам. Прыкладам гэтаму з'яўляецца Акт НДК па Хойніцкім раёне, у якім не пазначана інфармацыя аб знішчэнні цыган[6]. Пра тое, што 6 снежня 1942 г. у в. Казялужжа Хойніцкага раёна паліцыяй былі расстраляны тры сям'і цыган, *"у тым ліку малых дзяцей 5 чал., 3 жанчыны, стары 65 гадоў, трупы не давалі закапваць тры дні (тут і далей пераклад цытат аўтара)",* даведваемся толькі з пратаколу апытання сведкі[7].

Тым не менш, на наш погляд, дакументы НДК з'яўляюцца самымі інфарматыўнымі па сваёй сутнасці, асабліва па пытаннях месцаў знішчэння і пахавання. Зазначым, што ў ва многіх выпадках яны пазначаныя толькі таму, што носяць масавы характар, як правіла, гэта месцы масавага знішчэння яўрэйскага насельніцтва і цыганоў.

Што датычыць дакументаў нацысцкай акупацыйнай улады і карных органаў, у першую чаргу нямецкамоўных, то яны прадстаўленыя зводкамі, дакладнымі запіскамі і іншымі дакументамі начальніка паліцыі бяспекі і СД Германіі, у тым ліку і аб расстрэлах грамадзянскага насельніцтва на тэрыторыі Беларусі. Усе яны ў пэўнай ступені апублікаваныя ў шматлікіх зборніках дакументаў і матэрыялаў[8].

Але, на жаль, дадзены від дакументаў утрымлівае ў сабе толькі колькасны паказчык без указання месцаў злачынства. Да прыкладу, фрагмент са справаздачы аператыўнай групы "Б" у І Ц групе армій "Цэнтр" аб масавым знішчэнні грамадзянскага насельніцтва ў тыле групы армій "Цэнтр" за перыяд з 1 па 15 верасня 1942 г.: *"...асоба апрацаваных: асобая каманда 7А - 54 цыганы... асобая каманда 7Б - 46 цыган... асобая каманда 7Ц — 90 цыган..."*[9] і г. д. Як бачна, маем агульную колькасць знішчанага цыганскага насельніцтва, але не маем магчымасці вызначыць месцы расстрэлаў. Такім чынам, цыганы — ахвяры нацызму ў архіўных дакументах прапісваліся праз коску, або саюз "і", і заўсёды знаходзіліся ў ценю яўрэйскай трагедыі.

Пытанні мемарыялізацыі ахвяр цыганскага паходжання ў Беларусі не былі ў фокусе ўвагі даследчыкаў, што звязана з вышэйпазначанай праблемай малавывучанасці тэмы генацыду цыганоў. Для таго каб устанавіць помнік, трэба ведаць месца пахавання. У сувязі з гэтым на падставе архіўных дакументаў Дзяржаўнага архіва Расійскай Федэрацыі, Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь і апублікаваных крыніц з выкарыстаннем дасягненняў айчыннай і замежнай гістарыяграфіі ў дадзеным артыкуле зроблена спроба выяўлення і ідэнтыфікацыі "месцаў памяці" цыганскага народа на тэрыторыі Беларусі ў перыяд нацысцкай акупацыі і іх мемарыялізацыі.

**Праблема тэрміналогіі.** Знішчэнне яўрэйскага народа пазначаецца некалькімі тэрмінамі ў залежнасці ад гістарыяграфічных традыцый: "Шоа", "Катастрофа", "Халакост"[10] і г. д. Пры выкарыстанні аднаго з іх як на ўзроўні акадэмічных колаў, так і сярод грамадскасці, безумоўна, зразумела, што гаворка ідзе аб трагедыі яўрэйскага насельніцтва ў гады Другой сусветнай вайны, і яны паміж сабой не ўступаюць у супярэчнасць.

У той жа час у адносінах да знішчэння цыганоў у перыяд рэалізацыі расавай палітыкі нацыстаў, на наш погляд, выразна выпрацаванага падыходу не маецца. У нешматлікай акадэмічнай літаратуры, прысвечанай даследуемай тэме, выкарыстоўваюцца некалькі тэрмінаў — "Параймас" (або "Параімас"), "Халакост цыганоў", "генацыд цыганоў"[11].

Пры гэтым у навуковым асяроддзі назіраецца пэўная палеміка аб карэктнасці выкарыстання таго ці іншага тэрміна ў пазначэнні трагедыі цыганоў. Так, амерыканскай гістарыяграфіі, у прыватнасці Я.Хэнкаку, які і з'яўляецца аўтарам тэрміна "Параймас" ў разуменні "знішчэнне"[12], апаніруе расійская. Даследчыкам гісторыі цыганскага народа М.Бяссонавым аспрэчваецца дадзены тэрмін, які мае, на яго думку, *"для цыганоў глыбока абразлівае значэннё"*[13]. Грунтуючыся на сваіх эмпірычных ведах і довадах аднаго з нямецкіх гісторыкаў — В.Віпермана, ён лічыць, што будзе больш правільным выкарыстанне тэрміну "генацыд цыганоў"[14].

Так ці інакш, незалежна ад выкарыстоўваемага тэрміна працэс знішчэння цыганскага насельніцтва ў перыяд нацысцкай акупацыі на тэрыторыі Беларусі праходзіў планамерна, жорстка і бязлітасна.

*Схема*




**Знішчэнне цыганскага насельніцтва.** Як паказваюць архіўныя дакументы, знішчэнне цыганоў адбывалася пераважна пад час антыяўрэйскіх акцый, пра што можа сведчыць загад № 24 ад 24 лістапада 1941 г., які з'яўляецца не адзіным у сваім родзе: *"...яўрэі павінны знікнуць з твару зямлі, а таксама знішчаны і цыганы"*[15]. У тым жа 1941 г. у паведамленні ў штаб Шэнкендорфа камандзір 339-й пяхотнай дывізіі генерал-маёр Г.Хавельке прапанаваў *"выкараніць усіх шкоднікаў і бескарысных едакоў (уцекачоў і зноў злоўленых чырвонаармейцаў, валацугаў, яўрэяў і цыганоў"*[16].

Прыведзеныя дакументы даказваюць, што нацысцкія акупацыйныя ўлады ставілі знак роўнасці паміж яўрэйскім і цыганскім народамі як расава непаўнавартаснымі з іх наступным знішчэннем.

Аналіз архіўных дакументаў дазваляе выявіць агульную колькасць акцый у адносінах да цыганскага насельніцтва (схема). У большасці выпадкаў яны мелі несістэмны характар. Пры выяўленні цыганоў яны неадкладна знішчаліся. Пра гэта сведчаць і дадзеныя схемы, складзенай на падставе дакументаў НДК (ДАРФ. Фонд 7021).

Па меркаванні М.Бяссонава, расстрэлы вандроўных цыганоў СССР, у тым ліку і на тэрыторыі Беларусі, пачалі адбывацца з лета 1941 г. Вынішчэнне аселых цыганоў пачалося ў снежні таго ж года і поўнай сілы дасягнула вясной 1942 г.[17].

На тэрыторыі Беларусі першыя карныя акцыі зафіксаваны ў ліпені 1941 г. У лесе Крукаўка, што ў 1 км на паўночны ўсход ад г.п. Мёры, які стаў месцам масавага знішчэння яўрэйскага насельніцтва і ваеннапалонных, былі расстраляны і цыганы[18]. На жаль, месца знішчэння, адпаведна і пахавання вядомыя, а вось колькасць ахвяр сярод цыганоў у дакументах НДК не пазначана.

Па абагуленых дадзеных, з моманту пачатку нацысцкай акупацыі Беларусі зафіксавана 6 акцый па знішчэнні цыганоў. Са студзеня па снежань 1942 г. было здзейснена 11 расстрэлаў цыганскага насельніцтва. Апошняй датай іх знішчэння ў дакументах НДК пазначана 25 ліпеня 1943 г., калі расстралялі *"9 цыганак дарослых і 8 дзяцей"*, якія ўтрымліваліся ў турме г. Крычава[19]. Падкрэслім, што дадзены факт адпюстраваны толькі ў пратаколе допыту сведкі. Адзначым таксама, што ў дзесяці выпадках (29% ад агульнай колькасці) на дадзены момант не ўяўляецца магчымым устанавіць дату знішчэння.

Самым буйным па колькасці ахвяр сярод цыганскага насельніцтва на Беларусі з'яўляецца месца пахавання ва ўрочышчы Барок на ўскраіне г. Глыбокае. Па дадзеных НДК, тут пахавана каля 1000 чалавек[20]. Паводле сведчанняў відавочцы, расстрэлы цыган адбываліся сістэматычна на працягу 1941-1942 гг. Тое, што ўрочышча Барок стала месцам іх расстрэлу і пахавання, відавочца бачыў сам пры аглядзе расстрэльных ям, якія не былі цалкам закапаныя: *"Расстраляныя немцамі цыганы ляжалі ў некалькіх ямах, злёгку засыпаныя зямлёй. Твары і целы многіх з іх былі аголеныя і бачныя і сярод гэтых людзей я пазнаваў цыганоў"*[21].

У Полацку, Лідзе і г. п. Гарадзішча Баранавіцкага раёна была знішчана роўная колькасць цыганскага насельніцтва — па 100 чалавек у кожным з іх. Так, у Полацку ў пачатку лютага 1943 г. *"на маіх вачах (відавочца М.Усціновіч. —* **Аўт.)** *у адзін дзень павезлі на расстрел цыганоў 2 аўтамашыны колькасцю 100 чалавек адных старых, жанчын і дзяцей, сярод каторых было шмат грудных дзяцей"*[22]. На жаль, у дакументах НДК не маецца ніякіх сведчанняў пра месца іх знішчэння. Можна меркаваць, што гэта ўрочышча Пяскі, дзе хавалі не толькі савецкіх ваеннапалонных дулага-125 (*перасыльны лагер. —* **Аўт.**), але і грамадзянскае насельніцтва. Адзначым, што на тэрыторыі Полацка, па розных дадзеных, фіксуецца больш за 10 месцаў знішчэння мірнага насельніцтва[23].

Дадзеныя па факце расстрэлу цыганоў у Лідзе захаваліся дзякуючы зафіксаванай інфармацыі ў акце НДК: *"Магіла размешчана ў лесе ў 100 м ад узлеску, звернутага да насыпу стрэльбішча... У верасні 1941 г. нямецкія акупанты расстралялі ў тым жа лесе 100 чалавек цыганоў і невядомую колькасць ваеннапалонных"*[24]. У дадзеным выпадку нам вядома дакладнае месца пахавання.

Факт знішчэння цыганскага насельніцтва ў г. п. Гарадзішча зафіксаваны ў некалькіх дакументах НДК — у выніковым Акце і ў пратаколе апытання сведкі[25]. З Акта НДК вядома дакладнае месца пахавання — *"каля праваслаўных могілак у м. Гарадзішча ў 150 метрах расстраляны цыганы, партызаны і мясцовыя жыхары"*[25]. У пратаколе апісаны і працэс знішчэння: *"Вясной 1942 г. у м. Гарадзішча за царквой каля могілак нямецкія каты расстралялі ўсіх цыганоў, сярод якіх былі дзеці, старыя і жанчыны. Немцы ўжывалі самыя пакутлівыя метады знішчэння: у адной маці цыганкі, якую я добра ў твар ведала, але прозвішча яе не ведаю, немцы на яе руках грудному дзіцяці разбілі галаву, а тут жа і саму яе забілі, дзяцей на вачах у бацькоў клалі каля магілы і разбівалі ім галовы, а некаторым адсякалі"*[27]. У г. п. Гарадзішча цыганы знаходзіліся ў межах тэрыторыі яўрэйскага гета[28]. Што датычыцца колькасці ахвяр, то адзначым, што ў дакументах фіксуецца колькасць ад 40 да 100 чалавек. Існуе няпэўнасць па дакладнай даце знішчэння[29].

З акта агляду месца злачынства ад 1 лістапада 1943 г. па г. Мсціслаў вынікае, што *"на заходняй ускраіне гор. Мсціслава ў яры паміж Замкавай і Траецкай"* на працягу ўсяго перыяду нацысцкай акупацыі знішчана 850 чалавек яўрэяў, 35 цыганоў і 168 беларусаў[30].

Факт спалення цыганскага насельніцтва зафіксаваны ў в. Кашэвічы Капаткевічскага раёна (цяпер Петрыкаўскі раён Гомельскай вобласці), дзе 6 студзеня 1943 г. германскім атрадам пры акружэнні населенага пункта было арыштавана *"19 чалавек праязджаючых цыган"*, якіх *"без ніякай прычыны"* зачынілі ў хлеве і спалілі[31].

На вачах мясцовых жыхароў увосень 1943 г. былі расстраляныя 13 цыганоў у в. Смулькі Браслаўскага раёна, дзе яны і былі пахаваныя[32]. Адзначым, што гэта адно з нямногіх месцаў, дзе пахаваны толькі прадстаўнікі цыганскай нацыянальнасці.

У в. Прудок Крычаўскага раёна ў лютым 1943 г. каля могілак расстралялі ў першым выпадку 6 чалавек цыганоў і партызан[33] *(невядома колькасць.* **— Аўт.),** а ў другім — *"3 жанчыны па нацыянальнасці цыганкі, астатнія мужчыны"*, сярод якіх відавочцам былі распазнаны маскоўскія артысты па прозвішчах Космаў і Зузекін, якія пражывалі ў г. Крычаў[34].

У пратаколе допыту К.Цернаевай (рус. — Екатерина Терноева) ад 23 лістапада 1944 г. прыводзіцца наступная інфармацыя: *"У гэты ж дзень (не ўдакладняецца. —* **Аўт.**) *пасля заканчэння расстрэлу, які быў у 11 гадзін дня, а ў 12 гадзін дня з магілы, дзе былі трупы расстраляных, выйшла параненая цыганка 28 гадоў. Куля якой прайшла ў патыліцу і выйшла праз шчаку. Прыйшла ў в. Прудок у дом Колатавай Пелагеі, дзе знаходзілася некаторы час (не ўдакладняецца. —* **Аўт.**) *Потым у дом Колатавай зайшоў паліцэйскі, забраў цыганку і павёў у напрамку г. Крычаў, па дарозе гэтую цыганку расстраляў на лугу"*[35].

У дадзеным артыкуле прыведзеныя не ўсе факты знішчэння цыганскага насельніцтва на тэрыторыі Беларусі. Аўтарам складзеная табліца з назвамі населеных пунктаў і пазначэннем месцаў, дзе згодна са змешчанай у архіўных крыніцах інфармацыяй фіксуюцца выпадкі расстрэлаў цыганоў *(гл. табліцу на с. 30-31)*.

Такім чынам, калі браць колькасны паказчык, то на тэрыторыі Беларусі, па архіўных дадзеных, адбываліся расстрэлы ад 3 да 1000 чалавек з ліку прадстаўнікоў цыганскай нацыянальнасці. Практычна ўсе вядомыя нам пахаванні носяць змешаны характар, сярод якіх і вязні гета, лагераў для ваеннапалонных і партызаны.

Нельга абысці ўвагай звесткі об стварэнні двух канцэнтрацыйных лагераў для цыганоў каля Брэста і Узды[36]. У адпаведнасці з прыведзеным М.Бяссонавым архіўным дакументам у 1942 г. у Брэсце быў створаны цыганскі лагер на 800 чалавек, для аховы якога планавалася адправіць каманду ахоўнай паліцыі. Паводле апублікаваных дадзеных, у Брэсцкім лагеры знаходзіліся цыганы з Усходняй Прусіі, дэпартаваныя праз Беласток у Брэст. У красавіку 1944 г. іх перавезлі ў Асвенцым, дзе большасць з іх загінула[37]. У дакументах НДК пры іх першасным аналізе дадзеных аб функцыянаванні лагераў для цыганскага насельніцтва знойдзена не было.

**Маштаб трагедыі цыганоў Беларусі.** У гістарычнай літаратуры колькасць ахвяр генацыду цыганскага насельніцтва на тэрыторыі Беларусі вызначаецца як 3000 чалавек. Разгледзім гэтае пытанне падрабязней.

У сваім даследаванні М.Бяссонаў прыводзіць агульную лічбу стратаў цыганскай дыяспары СССР у 13 470 чалавек[38]. Што датычыцца Беларусі, то аўтар прыводзіць дадзеныя, раскладваючы іх па трох групах: страты цыганскай дыяспары СССР паводле афіцыйных крыніц і публікацый; страты цыганскай дыяспары згодна з вуснымі крыніцамі; страты па месцах масавых расстрэлаў[39]. Пры падсумаванні вышэйзгаданых дадзеных з улікам іх перакрыжаванага аналізу агульная колькасць ахвяр генацыду цыганоў у Беларусі складае 827 чалавек. Пры гэтым М.Бяссонаў акцэнтуе ўвагу на тым, што некаторыя звесткі прыведзены ўмоўна, бо няма ўдакладняючых лічбаў. Скептычна ён ставіцца і да інфармацыі па Глыбокім, у якім, паводле паказанняў сведкі А.Смольскага (на якія абапіраецца і Акт НДК па г. Глыбокае і Глыбоцкім раёне), на працягу 1941-1942 гг. было знішчана каля 1000 цыганоў[40]. Яшчэ адзін сведка трагедыі глыбоцкіх цыганоў А.Сабалеўскі канстатуе факт знішчэння, але не называў колькасць ахвяр[41]. М.Бяссонаў піша: *"Да сведчанняў Смольскага варта паставіцца вельмі ўважліва, але агульная колькасць ахвяр ім напэўна завышана. Не магла ў адным толькі Глыбоцкім раёне жыць такая каласальная колькасць цыганоў"*[42]. Таму ён вызначае ў дадзеным выпадку колькасць ахвяр 200 чалавек[43].

В.Калінін дае агульную лічбу ахвяр сярод цыганскага насельніцтва, загінулага на тэрыторыі Беларусі ў 1941-1944 гг. з улікам стратаў на франтах, каля 40%, пры гэтым лічыць, што на пачатку вайны на Беларусі пражывала каля 7000 цыганоў[44]. Пры матэматычным раскладзе атрымліваецца лічба ў 2800 чалавек.

На жаль, Дз.Крывашэй не дае сваёй ацэнкі стратам цыганоў і паказвае дадзеныя В.Калініна і Х.Герлаха. У



**Карта месцаў знішчэння і пахавання цыганскага насельніцтва ў перыяд гермамскай акупацыі Беларусі (1941—1944 гг.). Складзена аўтарам.**

**▼ — апазнавальны знак для цыганоў у канцэнтрацыйных лагерах нацысцкай Германіі.**

навуковым артыкуле А.Фрыдмана таксама не паказваюцца абагуленыя звесткі аб колькасці загінулых цыганоў на Беларусі, зноў ідзе адсылка да звестак Х.Герлаха[45]. Па меркаванні самаго нямецкага гісторыка, каля 3000 цыганоў сталі ахвярамі нацысцкай карнай палітыкі[46]. Зазначым, што ў выпадку са знішчэннем цыганоў ідзе адсылка ва ўрочышчы Барок (г. Глыбокае) Х.Герлах аперыруе дадзенымі НДК у 1000 чалавек[47].

Аўтарам артыкула ў ходзе аналізу архіўных крыніц вызначана 36 месцаў знішчэння цыганскага насельніцтва на тэрыторыі Беларусі ў перыяд 1941-1944 гг. *(гл. табліцу на с. 30-31).* Агульная колькасць ахвяр складае 2647 чалавек, пры гэтым у чатырох выпадках адсутнічаюць дадзеныя па стратах (Мёрскі, Магілёўскі, Жлобінскі, Клецкі раёны). Больш за тое, па Чачэрску пазначана агульная колькасць *"каля 400 чалавек цыганоў і яўрэяў"[45],* таму вызначыць па спісах як яўрэйскае, так і цыганскае насельніцтва не ўяўляецца магчымым.

Выведзеная аўтарам артыкула лічба 2647 ахвяраў генацыду цыганоў на тэрыторыі Беларусі пацвярджае агульныя страты сярод цыганскага насельніцтва папярэдніх даследчыкаў. Але, безумоўна, яна не канчатковая. Дакументы НДК, якія склалі аснову даследавання, без сумневу, не пазбаўленыя хібаў. Умовы, у якіх яны ствараліся, не ў поўнай меры спрыялі правядзенню ўсебаковага даследавання. Германскія дакументы (зводкі, справаздачы і г. д.) даюць нам толькі абагульненыя дадзеныя. Пры гэтым ёсць упэўненасць у тым, што выкарыстанне кампаратыўнага метаду пры аналізе ўсяго блока дакументаў, які раскрывае трагедыю цыганскага народа, дае магчымасць наблізіцца да максімальнага выніку.

**Праблемы захавання памяці.** Дзень памяці ахвяр генацыду цыганскага народа адзначаецца 2 жніўня. У гэты дзень у 1944 г. у газавай камеры ў Асвенцыме былі знішчаныя цыганы рознага ўзросту: *"Пасля газавай камеры трупы склалі ў канавы і спалілі, бо крэматорый не працаваў"[49].* Да раніцы наступнага дня цыганскае пытанне ў Асвенцыме было вырашана.

На тэрыторыі Беларусі, па афіцыйных дадзеных 2021 г., зарэгістравана 7002 воінскія пахаванні і месцы масавага знішчэння і пахавання мірнага насельніцтва перыяду Другой сусветнай вайны, дзе ўвекавечана памяць аб 2 078 253 чалавеках[50]. Але толькі некалькі помнікаў сведчаць аб трагедыі цыганскага народа.

Масавыя пахаванні ва ўрочышчы Барок на ўскраіне г. Глыбокае сталі месцам памяці аб загінулых савецкіх і італьянскіх ваеннапалонных, аб яўрэйскім, цыганскім, польскім і беларускім насельніцтве. На тэрыторыі самога ўрочышча пашпартызаваны тры брацкія магілы — № 2196, 5601 і 5602. На помніку пахавання № 5601 надпіс на чатырох мовах адсылае нас да ахвяраў трагедыі: *"Брацкая магіла 4,5 тысячы яўрэяў, палякаў, цыган і іншых мірных грамадзян, па-зверску знішчаных нямецкімі акупантамі".*

У 1967 г. на магіле ахвяр нацызму, размешчанай у 150 м на паўднёвы ўсход ад могілак у в. Навасяды Ашмянскага раёна, усталяваны абеліск[51]. У ёй пахаваныя 44 чалавекі, якія лічацца невядомымі (згодна рэестра пахаванняў — БМ № 6008)[52]. Помнік на месцы трагедыі быў абноўлены[53]. Паводле архіўных звестак, падзеі развіваліся наступным чынам: *"У 1942г. у лістападзе немцы рабілі аблаву, і ў в. Навасяды Навасядскага с/с было злоўлена 42 цыганы і адзін яўрэй, якія былі расстраляныя на ўскрайку лесу і закапаныя, магіла якіх абгароджаная і пастаўлены драўляны крыж, збіты з дзвюх драўляных палак, магіла знаходзіцца на поўдзень ад Навасядскіх могілак на адлегласці 150 метраў ад в. Навасяды"[54].* У Акт НДК па раёне ўвайшла лічба ў 44 чалавекі, з якіх 42 — цыганы[55].

На ўездзе ў Міхнавіцкі лес паміж вёскамі Калдычава і Міхнаўшчына ў 2007 г. быў адкрыты яшчэ адзін помнік ахвярам генацыду[56], сярод якіх былі два цыганскія табары. Скульптура маці ў жалобе была ўсталяваная яшчэ ў 1964 г. на месцы Калдычаўскага лагера смерці[57], але не былі вызначаны месцы пахванняў. У 2004 г. на месцы расстрелу цыганскай дыяспарай устаноўлены крыж з надпісам: *"Тут ляжаць нашыя браты-цыганы".* Гэта быў адзіны помнік ахвярам генацыду цыганскага народа на постсавецкай прасторы[58].

Трэба адзначыць, што *ўсе* брацкія магілы, у якіх пахавана цыганскае насельніцтва, не маюць прозвішчаў на шыльдзе. Невялікі спіс ахвяраў у 17 чалавек, які ўтрымліваюць матэрыялы НДК па г. Гомель[59], — практычна адзіны, дзе зафіксаваная нацыянальнасць ахвяраў. Але пры верыфікацыі гэтага спісу ў аўтаматызаваным банку дадзеных "Кніга памяці" Рэспублікі Беларусь ніводнае імя не было знойдзена сярод увекавечаных. Гэтае пытанне складанае, бо месцы масавага пахавання ў цэлым мала ідэнтыфікуюцца.

[1]Бартош О. Э. Традиционная социальная культура цыган Беларуси в конце XX — начале XXI века : Автореф. дис.... канд. ист. наук. Минск, 2010 .

[2] Кривошей Д.А. Судьбы народов Беларуси под оккупацией (июнь 1941 г. — июль 1944 г.). Москва, 2017. С. 187—192.

[3] Бессонов Н. Цыганская трагедия 1941—1945: факты, документы, воспоминания. Т. 1. Геноцид цыган во время Второй мировой войны. Москва, 2020.

[4] Фрыдман А. Невядомы генацыд: знішчэнне беларускіх цыганоў у 1941—1944 // Arche. 2004. №2 (31). С. 130-142; Фридман А. "Только потому, что они цыгане...". К вопросу о геноциде цыганского населения Беларуси в период немецко-советской войны // Голокост і сучасність. 2009. №2 (6). С. 168-171.

[5] Бессонов Н. Цыганская трагедия 1941—1945: факты, документы, воспоминания. Т. 1. С. 120.

[6] Государственный архив Российской Федерации (далее — ГАРФ). Ф. 7021, оп. 91, д. 24, л. 2 — 2 об.

[7] Там жа. Л. 20 об.

[8] Преступления немецко-фашистских оккупантов в Белоруссии 1941—1944. Минск, 1965; Свидетельствуют палачи. Уничтожение евреев на оккупированной территории Беларуси в 1941—1944 гг.: документы и материалы / сост.: В.И.Адамушко, И.П.Герасимова, В.Д.Селеменев; науч. ред. С.Е.Новиков. Минск, 2009; Без срока давности. Беларусь: преступления нацистов и их пособников против мирного населения на оккупированной территории БССР в годы Великой Отечественной войны. Витебская область. Сборник архивных документов и материалов / сост.: А.Р.Демянюк, В.Д.Селеменев и др. Минск, 2020.

[9] Преступления немецко-фашистских оккупантов в Белоруссии 1941—1944. С. 68.

[10] Розенблат Е.С. Холокост — геноцид — этноцид. К терминологии вопроса // Великая Отечественная война 1941—1945 гг. в исторической памяти народа : сб. науч. ст. Брест, 2020. С. 163-169.

[11] Бессонов Н. Об использовании терминов "Пораймос" и "Холокост" в значении "геноцид цыган" // Голокост і сучасність. 2007. № 1 (7). С. 71 — 82.

[12] Бессонов Н. Цыганская трагедия 1941—1945: факты, документы, воспоминания.

[13] Бессонов Н. Об использовании терминов "Пораймос" и "Холокост" в значении "геноцид цыган" // Голокост і сучасність. 2007. № 1 (7). С. 73.

[14] Wippermann W. "Auserwählte Opfer?". Shoah und Porrajmos im Vergleich: Eine Kontroverse. Berlin, 2005.

[15] Из приказа № 24 от 24 ноября 1941 г. // Свидетельствуют палачи. Уничтожение евреев на оккупированной территории Беларуси в 1941—1944 гг.: документы и материалы. С. 52.

[16] Жуков Д.А., Ковтун И.И., Жуков Д.А., Кулинок С.В. Цербер армейского тыла. Генерал Макс фон Шенкендорф и журнал боевых действий его штаба. Москва, 2022. С. 24-25.

[17] Бессонов Н. Об использовании терминов "Пораймос" и "Холокост" в значении "геноцид цыган". С. 79.

[18] ГАРФ. Ф. 7021, оп. 92, д. 217, л. 3, 9, 31.

[19] Там жа. Оп. 88, д. 41, л. 20.

[20] Там жа. Оп. 92, д. 212а, л. 9, 13, 33-34.

[21] Там жа. Л. 33; Бессонов Н. Цыганская трагедия 1941—1945: факты, документы, воспоминания. С. 123.

[22] ГАРФ. Ф. 7021, оп. 92, д. 220, л. 54 об.

[23] Там жа. Оп. 92, д. 220, лл. 1,4,6,49 об., 52 об., 54 об. — 55 об., 57, 67, 71 об., 75 об., 78-78 об., 79, 89 об., 96 об., 101 об.— 102, 105 об.

[24] Там жа. Оп. 86, д. 42, л. 3.

[25] Там жа. Оп. 81, д. 102, лл. 37-38; ГАРФ. Ф. 7021, оп. 81, д. 103, л. 4-5.

[26] Там жа. Д. 103, л. 4-5.

[27] Там жа.

[28] Там жа. Д. 103, л. 4-5.

[29] Там жа. Д. 102, л. 37-38; Д. 103, л. 4-5.

[30] Там жа. Оп. 88, д. 45, л. 9 об.

[31] Там жа. Оп. 91, д. 17, л. 3 об., 44.

[32] Там жа. Оп. 92, д. 209, лл. 19 об., 21 об., 68 об.

[33] Там жа. Оп. 88, д. 41, л. 13 об.

[34] Там жа. Д. 41, л. 13.

[35] Там жа. Д. 41, л. 13 об.

[36] Бессонов Н. Цыганская трагедия 1941—1945: факты, документы, воспоминания. Т. 1. С. 120; Калинин В.И. Загадка балтийских цыган: очерки истории, культуры и социального развития балтийский цыган.

[37] Бессонов Н. Цыганская трагедия 1941—1945: факты, документы, воспоминания. Т. 1. С. 121.

[38] Там жа. С. 426.

[39] Там жа. С. 414-415, 424, 425.

[40] ГАРФ. Ф. 7021, оп. 92, д. 212а, л. 9, 13, 33-34.

[41] Там жа. Л. 13.

[42] Бессонов Н. Цыганская трагедия 1941—1945: факты, документы, воспоминания. Т. 1. С. 123.

[43] Там жа. С. 425.

[44] Калинин В.И. Загадка балтийских цыган: очерки истории, культуры и социального развития балтийский цыган. С. 95, 98.

[45] Фрыдман А. Невядомы генацыд: знішчэнне беларускіх цыганоў у 1941—1944. С. 142.

[46] Gerlach Ch. Kalkulierte Morde: Die deutsche Wirtschafts- und Vernichtungspolitik in WeilJrussland 1941 bis 1944. Hamburg, 1999. S. 1006.

[47] Ibidem. S. 1065.

[48] ГАРФ. Ф. 7021, оп. 85, д. 44, л. 4 об. — 5, 79-79 об.

[49] Кенрик Д., Паксон Г. Цыгане под свастикой. Москва, 2001. С. 184-185.

[50] Автоматизированный банк данных "Книга памяти" Республики Беларусь. Статистическая информация // Управление по увековечению памяти защитников Отечества и жертв войн Вооружённых Сил Министерства обороны Республики Беларусь.

[51] Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Гродзенская вобласць. Мінск, 1986. С. 109.

[52] Каталог воинских захоронений на территории Беларуси. Гродненская область. Минск, 2015.

[53] Памятник расстрелянным в годы войны цыганам в Ошмянском районе (відэа) [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: http://www.osh.by/?p=81863. Дата доступу: 09.05.2022.

[54] ГАРФ. Ф. 7021, оп. 89, д. 12, л. 40.

[55] Там жа. Л. 2.

[56] Лихута И. Колдычевский лагерь смерти // Беларусь Сегодня от 29.06.2010 [Электронный ресурс]. Режим доступа: https://www.sb.by/articles/koldychevskiy-lager-smerti.html. Дата доступа: 09.05.2022; Яскевич С. Как на территории Беларуси фашисты уничтожали цыганское население // Звязда от 11.04.2022 [Электронный ресурс]. Режим доступа : https ://zviazda. by/ru/news/20220411/1649662439-kak-na-territorii-belarusi-fashisty-unichtozhali-cyganskoe-naselenie. Дата доступа: 09.05.2022.

[57] Свод памятников истории и культуры Белоруссии. Брестая область. Минск, 1990.

[58] Яскевич С. Как на территории Беларуси фашисты уничтожали цыганское население.

[59] ГАРФ. Ф. 7021, оп. 85, д. 256, л. 29 — 29 об.

*Табліца*

**Спіс месцаў знішчэння цыганоў на акупаванай тэрыторыі Беларусі**

| № п/п | Населены пункт і месца знішчэння | Колькасць | Час знішчэння | Крыніцы |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | в. Заастравечча, Клецкі раён, на ўскраіне вёскі | невядома | восень 1942 г. | Бессонов Н. Цыганская трагедия 1941—1945: факты, документы, воспоминания. Т. 1. С. 121. |
| 2 | в. Палыкавічы, Магілёўскі раён, *"1 км на ўсход ля ўскрайку лесу"* | невядома | лістапад 1943 г. | Преступления немецко-фашистских оккупантов в Белоруссии 1941—1944. С. 36. |
| 3 | г. Жлобін, месца пахавання невядома | невядома | 12 красавіка 1942 г. | Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі (далей — ДАРФ). Ф. 7021, воп. 85, спр. 214, арк. 3, 28. |
| 4 | г.п. Мёры, месца пахавання невядома | невядома | ліпень 1941 г. | Там жа. Воп. 92, спр. 217, арк. 3. |
| 5 | г. Глыбокае, урочышча Барок | 1000 | 1941—1942 гг. | Там жа. Спр. 212а, арк. 3. |
| 6 | г. Чачэрск, у супрацьтанкавым рове | 400 (разам з яўрэямі) | 28 снежня 1941 г. | Там жа. Воп. 85, спр. 44, арк. 4 адв. — 5, 75 адв. — 76, 79 — 79 адв. |
| 7 | г. Полацк, месца пахавання невядома | 100 | пачатак лютага 1943 г. | Там жа. Воп. 92, спр. 220, арк. 54 адв. |
| 8 | г.п. Гарадзішча, Баранавіцкі раён, *"каля праваслаўных могілак"* | 100 | 3 лістапада 1942 г. | Там жа. Воп. 81, спр. 102, арк. 37—38; спр. 103, арк. 4—5. |
| 9 | г. Ліда, *"у лесе ў 100 м ад узлеску, звернутага да насыпу стрэльбішча"* | 100 | верасень 1941 г. | Там жа. Воп. 86, спр. 42, арк. 3. |
| 10 | в. Мсцібава, Ваўкавыскі раён | 13 сямей (каля 80 чалавек) | невядома | Там жа. Воп. 86, спр. 37, арк. 6 адв. |
| 11 | г. Ветка, *"1 км на поўнач ад горада"* | 61 | верасень 1942 г. | Там жа. Воп. 85, спр. 36, арк. 2. |
| 12 | Кашыцкі лес, у 4—5 км ад г. Паставы | 60 | 1942 г. | Там жа. Воп. 89, спр. 13, арк. 2. |
| 13 | г. Клецк, месца пахавання невядома | 60 | кастрычнік 1941 г. | Бессонов Н. Цыганская трагедия 1941—1945: факты, документы, воспоминания. С. 121. |
| 14 | г. п. Церахоўка, Добрушскі раён, *"у яме паблізу млына райпрамкамбінату"* | 58 | верасень 1942 г. | ДАРФ. Ф. 7021, воп. 85, спр. 42, арк. 2. |
| 15 | г. Дрыбін, расстраляныя ў г. Горкі | 45 | вясна 1943 г. | Бессонов Н. Цыганская трагедия 1941 — 1945: факты, документы, воспоминания. С. 119. |
| 16 | д. Навасяды, Ашмянскі раён, *"каля вёскі"* | 42 | лістапад 1942 г. | ДАРФ. Ф. 7021, воп. 89, спр. 12, арк. 2, 40. |
| 17 | г. Узда, *"на поўнач ад м. Узда каля ста метраў на былых яўрэйскіх могілках"* | 35 | май 1942 г. | Там жа. Воп. 87, спр. 15, арк. 2, 9. |
| 18 | г. Мсціслаў, *"на заходняй ускраіне гор. Мсціслаў у яры паміж Замкавай і Траецкай"* | 35 | кастрычнік 1941 г. | Там жа. Воп. 88, спр. 45, арк. 9адв. |
| 19 | г. Рагачоў, *"у рове за кардоннай фабрыкай у 70 метрах ад ракі Друць"* | 30 | сакавік 1942 г. | Там жа. Воп. 85, спр. 218, арк. 3. |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 20 | Слонімскі раён, месца расстрэлу і пахавання невядомыя | 30 | кастрычнік 1942 г. | Преступления немецко-фашистских оккупантов в Белоруссии 1941—1944. С. 36. |
| 21 | в. Жодзішкі, Смаргонскі раён, месца пахавання невядома | 25 | 1942 г. | ДАРФ. Ф. 7021, воп. 89, спр. 15, арк. 5, 84. |
| 22 | паміж г. Косава і в. Быцень, Івацэвіцкі раён, месца пахавання невядома | 24 | кастрычнік 1942 г. | Преступления немецко-фашистских оккупантов в Белоруссии 1941—1944. С. 36. |
| 23 | г. Мінск, месца пахавання невядома | 23 | невядома | НАРБ. Ф. 1440, воп. 3, спр. 945, арк. 49, 55—56. |
| 24 | в. Кашэвічы, Петрыкаўскі раён, *"спаленыя жыўцом"* | 19 | 6 студзеня 1943 г. | ДАРФ. Ф. 7021, воп. 91, спр. 17, арк. 3 адв., 44. |
| 25 | в. Смулькі, Браслаўскі раён, месца пахавання невядома | 13 | восень 1943 г. | Там жа. Воп. 92, спр. 209, арк. 19 адв., 21 адв., 68 адв. |
| 26 | в. Прудок, Крычаўскі раён, *"каля могілак"* | 6 | люты 1943 г. | Там жа. Воп. 88, спр. 41, арк. 13 адв. |
| 27 | в. Прудок, Крычаўскі раён, *"каля могілак"* | 3 | люты 1943 г. | Там жа. Воп. 88, спр. 41, арк. 13. |
| 28 | г. Браслаў, *"у канец гор. Браслава, і там расстралялі"* | 19 | 1942 г. | Там жа. Воп. 92, спр. 209, арк. 37, 151 адв. |
| 29 | г. Крычаў, месца пахавання невядома | 17 | 25 ліпеня 1943 г. | Там жа. Воп. 88, спр. 41, арк. 20. |
| 30 | д. Ліпінічы, Буда-Кашалёўскі раён, месца пахавання невядома | 17 | невядома | Бессонов Н. Цыганская трагедия 1941 — 1945: факты, документы, воспоминания. С. 118. |
| 31 | г. Гомель, месца пахавання невядома | 17 | 1943 г. | ДАРФ. Ф. 7021, воп. 85, спр. 256, арк. 29 — 29 адв. |
| 32 | в. Казялужжа, Хойніцкі раён, месца пахавання невядома | 9 | 6 снежня 1942 г. | Там жа. Воп. 91, спр. 276, арк. 20 адв. |
| 33 | в. Ціжышкі, Смаргонскі раён, на ўскрайку вёскі | 7 | снежань 1941 г. | Там жа. Воп. 89, спр. 15, арк. 45. |
| 34 | г. Ляхавічы, месца пахавання невядома | 6 | жнівень 1942 г. | Бессонов Н. Цыганская трагедия 1941—1945: факты, документы, воспоминания. С. 122. |
| 35 | г. п. Багушэўск, Сенненскі раён | 6 | невядома | Там жа. С. 118. |
| 36 | На ўездзе ў Міхнавіцкі лес паміж в. Калдычава і Міхнаўшчына | 200 | невядома | Яскевич С. Как на территории Беларуси фашисты уничтожали цыганское население. |
| **Агульная колькасць** | | 2647 | | |

*Даследаванне выканана ў рамках ДПНД "Грамадства і гуманітарная бяспека беларускай дзяржавы", падпраграма 12.1 "Гісторыя" на 2021—2025 гг. Заданне 12.1 "Мемарыялізацыя воінскіх пахаванняў і месцаў знішчэння насельніцтва германскімі акупантамі ў 1941-1944 гг. на тэрыторыі Беларусі" ў рамках задання "Ваенная гісторыя Беларусі як фактар забеспячэння гуманітарнай бяспекі беларускай дзяржавы".*